# ПОЛАЦКІ КАЛЕДЖ ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА АДСВЯТКАВАЎ 150-ГОДДЗЕ

***Больш за 600 навучэнцаў, 5 спецыяльнасцей, высокапрафесійны калектыў, 78% супрацоўнікаў якога маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, – гэта Полацкі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава сёння. А за плячыма – 150-гадовая гісторыя, 17,7 тысяч выпускнікоў, тысячы ўрокаў і мерапрыемстваў, сотні лёсаў людзей, што прысвяцілі сваё жыццё служэнню педагагічнай прафесіі.***





Гісторыя каледжа пачалася ў далёкім 1872 годзе, калі была адкрыта Полацкая настаўніцкая семінарыя. Яе задачай было забяспечыць кадрамі пачатковыя класы школ рэгіёна. Сёння ж Полацкі каледж рыхтуе спецыялістаў у сферы дашкольнай, пачатковай і музычнай адукацыі, па замежнай мове, а таксама па спецыяльнасці «Арганізацыя гасцінічных паслуг». У 2022 годзе каледж быў занесены на Дошку гонару Полацка і Полацкага раёна.

Узначальвае каледж Таццяна Полушкіна, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь». Таццяна Генадзьеўна – выпускніца нашага ўніверсітэта (тады – педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава). У 1974 годзе пасля заканчэння полацкай школы №13 яна паступіла на філалагічны факультэт ВДПІ імя С.М. Кірава. Атрымаўшы дыплом аб вышэйшай адукацыі, вярнулася ў родны горад і два гады адпрацавала настаўніцай беларускай і рускай мовы, затым – арганізатарам пазашкольнай і пазакласнай работы ў полацкай сярэдняй школе №7. Па конкурсе ў 1981 годзе Таццяна Полушкіна стала выкладчыкам Полацкага педагагічнага вучылішча, потым былі пасады старшыні прафсаюзнага камітэта, намесніка па вучэбнавытворчай рабоце. З 1999 года яна займае пасаду дырэктара.

Ва ўстанове працуюць 88 педагогаў, большасць якіх з'яўляюцца выпускнікамі каледжа. Выкладчыкі прымаюць актыўны ўдзел як у рэспубліканскіх, так і ў міжнародных навукова-практычных канферэнцыях, рыхтуюць навукова-метадычныя артыкулы для профільных газет і часопісаў, перамагаюць на рэспубліканскіх выставах перадавога педагагічнага вопыту.

Полацкі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава падтрымлівае сувязі з навучальнымі ўстановамі не толькі Беларусі, але і бліжняга замежжа: да прыкладу, заключаны пагадненні аб двухбаковым супрацоўніцтве з пяццю расійскімі педагагічнымі каледжамі. Да таго ж каледж удзельнічае ў эксперыментальным інавацыйным праекце «Распрацоўка і апрабацыя электроннага адукацыйнага рэсурсу для інтэграцыі ў адзіны адукацыйны рэсурс для ўстаноў ПТА і ССА».

Вялікая ўвага надаецца выхаваўчай і ідэалагічнай працы. У каледжа ёсць свой музей, а творчыя калектывы ўстановы вядомы далёка за межамі Полацка, тры з іх маюць званне народных. Не забываюць там і пра спорт, адно са значных дасягненняў апошняга часу – бронза на рэспубліканскіх спаборніцтвах па валейболе сярод сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. Акрамя таго, на працягу апошніх дваццаці гадоў каледж на 100% выконвае кантрольныя лічбы прыему па ўсіх спецыяльнасцях і без цяжкасцей размяркоўвае выпускнікоў па розных рэгіёнах рэспублікі.

Намаганні выкладчыкаў навучальнай установы накіраваны на тое, каб падрыхтаваць высокакваліфікаваныя педагагічныя кадры і выхаваць годных патрыётаў сваёй краіны. І гэта задача паспяхова вырашаецца на працягу ўсёй 150-гадовай гісторыі.

Святочнае мерапрыемства, прысвечанае юбілею каледжа, адбылося напрыканцы кастрычніка ў канцэртнай зале «Полацк». Павіншаваць супрацоўнікаў і педагогаў, падзякаваць за працу, а таксама ўручыць заслужаныя ўзнагароды прыйшлі прадстаўнікі ўлады і грамадскіх аб'яднанняў, а ў зале прысутнічала шмат выпускнікоў, ветэранаў працы і проста добрых сяброў гэтай навучальнай установы. Сярод ганаровых гасцей вечара былі першы намеснік міністра адукацыі Ірына Старавойтава, старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Таццяна Якубовіч, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Дурноў і іншыя. Са шчырымі віншаваннямі выступіла рэктар ВДУ імя П.М. Машэрава, прафесар Валянціна Багатырова, якая адзначыла, што для ўніверсітэта – гонар мець у сваёй структуры такую знакавую ўстанову адукацыі.



У гэты вечар прагучала шмат прыемных слоў і шчырых пажаданняў, выступілі творчыя калектывы каледжа, універсітэта, горада, а прысутныя прызналіся альма-матэр у любові і адзначылі, што каледж і далей будзе квітнець, бо знаходзіцца пад аховай і заступніцтвам святой Еўфрасінні Полацкай.

**Тэкст і фота**
**Алесі ДУБРОЎСКАЙ.**

Фота- і відэарэпартаж са святкавання юбілея глядзіце з дапамогай QR-кода.